# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 24 (120) | Пятніца, 1 верасня 1972 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.

## ДОБРАГА ШЛЯХУ, ПЕРШАКУРСНІК!

**Дарагія першакурснікі!**

Рэктарат, партком, камітэт ЛКСМБ, прафком і мясцовы камітэт горача і сардэчна віншуюць вас з уступленнем у дружную сям'ю савецкіх студэнтаў.

Вы паступілі ва універсітэт у знамянальны для ўсёй нашай краіны год. 1972 год увойдзе ў гісторыю чалавецтва як год залатога юбілею Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. І мы спадзяемся, што вы сваёй выдатнай вучобай, актыўным удзелам у грамадска-палітычным жыцці дастойна сустрэнеце гэта ўсенароднае свята.

Няхай заўсёды вашым дэвізам будуць словы вялікага народнага правадыра Уладзіміра Ільіча Леніна: «Вучыцца, вучыцца і вучыцца». Абавязак кожнага з вас — упарта і настойліва авалодваць ведамі. Гэта неабходна для таго, каб вы змаглі з гонарам апраўдаць давер'е нашага народа на любым участку камуністычнага будаўніцтва.

Мы чакаем ад вас не толькі добрай вучобы. Вы павінны быць сапраўднымі патрыётамі нашай сацыялістычнай Радзімы, перакананымі прапагандыстамі новага камуністычнага грамадства і барацьбітамі супраць усіх і ўсялякіх праяўленняў чужой нам буржуазнай ідэалогіі.

Гэты навучальны год пачынаецца ва ўмовах, калі ўся наша краіна, увесь савецкі народ плённа і з энтузіязмам працуе над выкананнем велічных планаў другога года пяцігодкі, рыхтуе свае працоўныя падарункі паўвекавому юбілею нашай шматнацыянальнай дзяржавы.

Выказваем упэўненасць, што вы, учарашнія рабочыя і калгаснікі, ваеннаслужачыя і выпускнікі школ, а сёння — прадстаўнікі шматмільённай студэнцкай сям'і, будзеце даражыць ганаровым імем — імем студэнта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Жадаем вам, дарагія сябры, поспехаў у вучобе і актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці універсітэта, горада і вобласці.

Добрага шляху, першакурснікі, у краіну ведаў!

**У. А. БЕЛЫ,**
рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР, доктар тэхнічных навук, прафесар.
**У. В. КАЗЛОЎ,**
сакратар парткома.
**Ф. Ф. ГАНЧЭЛЬ,**
старшыня мясцкома, дацэнт.
**М. Л. БАЙДА,**
старшыня прафкома.
**Я. М. БАБІЧАЎ,**
намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ.

## ДАРОГА Ў КРАІНУ ВЕДАЎ

**825 першакурснікаў з вялікім хваляваннем запоўнілі універсітэцкія аўдыторыі. Сёння ў ГДУ прыйшло новае папаўненне студэнцкай сям'і. Рознымі шляхамі ішлі юнакі і дзяўчаты да ажыццяўлення сваёй мары. Адны — яшчэ ўчора развіталіся са школай, у іншых — за плячыма гады работы на заводах і фабрыках, у сельскагаспадарчай вытворчасці і іншых галінах народнай гаспадаркі — працоўная біяграфія.**

**Гэтыя тры здымкі — кароткія імгненні вашага жыцця, вашага шляху ў краіну ведаў. На левым — будучыя абітурыенты знаёмяцца з лабараторыяй фізічнага факультэта. Ідзе пісьмовы экзамен. Цішыня і засяроджанасць. Юнацтва штурмуе навуку.**

**Праляцелі першыя тыдні жніўня. Перад прыёмнай камісіяй прайшлі ўсе кандыдаты ў студэнты. Лепшыя з іх з радасцю і задавальненнем убачылі свае прозвішчы ў ліку залічаных у Гомельскі дзяржаўны універсітэт.**







## ЧАЦВЁРТЫ ЎНІВЕРСІТЭЦКІ

Аўдыторыі універсітэта запоўнілі шчаслівыя першакурснікі чацвёртага універсітэцкага прыёму. Ім давялося нямала папрацаваць каб паспяхова здаць экзамен на права быць студэнтам строгім экзаменатарам-прафесарам, дацэнтам і выкладчыкам універсітэта. Выстаялі лепшыя, найбольш падрыхтаваныя, не толькі прафесіянальна, калі так можна сказаць, але і фізічна, і маральна. У працэсе ж экзаменаў і конкурснага адбору павінны былі «адсеяцца» ў сярэднім больш двух трэціх жадаючых паступіць ва універсітэт, а на асобныя спецыяльнасці мог паступіць толькі адзін з 5 — 10, у той час як паступалі лепшыя выпускнікі школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў: 89 чалавек атрымалі залатыя медалі або дыпломы з адзнакай, 462 былі ўзнагароджаны пахвальнымі граматамі за поспехі ў вывучэнні асобных прадметаў. Сярэдні бал атэстатаў паступаючых ва універсітэт склаў больш 4,2, а паступаючых на спецыяльнасць «Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі» — 4,54, на механіка-матэматычны факультэт — 4,44. У параўнанні з мінулым годам сярэдні бал атэстатаў абітурыентаў рэзка «падскочыў». У мінулым годзе нават па прафіліруючых дысцыплінах сярэдні бал быў ніжэй.

Як паказалі ўступныя экзамены, тлумачыцца гэта не столькі значным павышэннем якасці падрыхтоўкі ў школах, або ўзрослай папулярнасцю універсітэта, колькі рэакцыяй школы на змяненне ў правілах прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. У гэтым годзе ўпершыню сярэдні бал атэстата і адзнака на ўступных экзаменах па рускай мове і літаратуры (пісьмова) уваходзяць у конкурсны бал. Відавочна, ва многіх школах, не зразумеўшы сэнсу нованўвядзенняў, замест павышэння патрабавальнасці да адзнакі сваіх выпускнікоў і адказнасці за іх, пайшлі па шляху неапраўданага павышэння адзнак. У выніку многія добрыя і выдатныя вучні школы ўходзілі з экзаменаў незадаволенымі, атрымаўшы заслужаную «тройку». Каля 18 працэнтаў падаўшых заявы «адсеяліся», не з'явіўшыся на першы або чарговы экзамен, 30 працэнтаў ад колькасці паступаючых атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Толькі нямногім больш палавіны падаўшых заявы паспяхова вытрымалі ўсе экзамены. Пры гэтым трэба сказаць, што адзнакі, выстаўленыя нашымі экзаменатарамі, практычна не змяніліся ў параўнанні з мінулым годам.

Закончыліся уступныя экзамены. Вынікі іх падведзены і зафіксіраваны ў справаздачах экзаменацыйных камісій і пратаколах прыёмнай камісіі. Хто ж атрымае сёлета студэнцкія білеты — білеты першакурснікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта? Па-першае, 101 выпускнік падрыхтоўчага аддзялення. Год назад гэтыя юнакі і дзяўчаты стаялі ля станка, працавалі на палях і фермах, служылі ў Савецкай Арміі, а сёння ўліваюцца ў дружную студэнцкую сям'ю. Сярод іх: Л. Ізмесцьева — сакратар камсамольскай арганізацыі Бабруйскай трыкатажнай фабрыкі, цяпер студэнтка гісторыка - філалагічнага факультэта, былыя воіны, выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі В. Громаў — студэнт эканамічнага факультэта, В. Пузырын — скончыўшы чатыры гады назад сярэднюю школу з сярэбраным медалем і ўзнагароджаны юбілейным медалем «За воінскую доблесць» у азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, — студэнт механіка-матэматычнага факультэта, Л. Свірыдзенка, палявод з калгаса імя Ульянава Буда-Кашалёўскага раёна — студэнт эканамічнага факультэта. Усяго сярод першакурснікаў каля 22 працэнтаў маюць стаж работы больш двух гадоў, 60 працэнтаў складаюць рабочыя, калгаснікі і іх дзеці, больш трэці пастаянна пражываючыя ў сельскай мясцовасці.

Медалісты, як правіла, паспяхова здалі ўступныя экзамены і сталі студэнтамі універсітэта. У ліку першакурснікаў 83 медалісты і выдатнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Больш за ўсё медалістаў і выдатнікаў—23—паступіла на механіка-матэматычны факультэт. Паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены і паступілі ва універсітэт многія пераможцы абласных, гарадскіх і раённых алімпіяд, напрыклад, П. Мельнікаў з Веткі — пераможца фізічнай алімпіяды паступіў на фізічны факультэт, Л. Багданава з Гомеля, пераможца матэматычнай алімпіяды — на эканамічны. Н. Рабцоў з Жлобіна і В. Трухан з Лоеўскага раёна, пераможцы матэматычных алімпіяд, — на механіка-матэматычны і многія іншыя. Н. Рабцаў, акрамя таго, — пераможца гарадскога конкурсу маладога токара і слесара 1972 года.

Сярод першакурснікаў многа іншых цікавых юнакоў і дзяўчат. Вось толькі некаторыя з паступіўшых на фізічны факультэт. В. Гарбатоўская — сакратар камсамольскай арганізацыі Камунараўскай сярэдняй школы Буда-Кашалёўскага раёна. За ўдзел у стварэнні Ленінскага музея яна ўзнагароджана медалем ВДНГ і грашовай прэміяй, якую перадала ў фонд дапамогі в'етнам-

(Заканчэнне на 3 стар.).

